**Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 1 кастрычніка. Дзякуючы відэасувязі да пасяджэння таксама далучыліся кіраўнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.**

Удзельнікі сходу абмеркавалі шэраг пытанняў па прафесійнай падрыхтоўцы адмыслоўцаў галіны ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Гаварылі ў тым ліку пра стварэнне групы з таленавітай моладзі ў БДУКМ для падрыхтоўкі дасведчаных, канкурэнтаздольных рэжысёраў масавых свят рэспубліканскага ўзроўню. Былі заслуханы і зацверджаны прапановы па арганізацыі адбору нумароў найлепшых навучэнцаў і творчых калектываў розных устаноў адукацыі ў сферы культуры для буйных масавых мерапрыемстваў.

Падчас нарады прагучала справаздача аб падрыхтоўцы да святкавання 100-годдзя беларускага кіно і раскладзе асноўных урачыстасцей. Таксама гаворка ішла пра вынікі выканання тарыфнага пагаднення з прафсаюзамі.